УДК 930(476)

# НАРАДЖЭННЕ БНР: ПОГЛЯД ЗДАЛЕК

Л.Ю. Малыхіна
Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт.

Есць у навейшай гісторыі нашага краю старонкі, якія дагэтуль навуковым ассяроддзем успрымаюцца неадназначна: нацыянальнае адраджэнне беларусаў. Адкуль вядзецца пачатак Беларускай Народнай Рэспублікі? Якую падзею паклалі ў падмурак канца яе? І ці існавала ўвогуле такая дзяржава?.. Здаецца сучаснай навукай пастаўлены ўсе кропкі, і тым не менш няма больш аморфнай, спрэчнай падзеі ў гісторыі дзяржаўнасці, чым нараджэнне БНР.

Прынята лічыць, што ўпершыню праблема ўтварэння Беларускай Народнай Рэспублікі стала ўздымацца ў савецкай гістарыяграфіі. Сапраўды, гістарычная школа БССР была сфарміравана як навука ў 20-30-я гады XX стагоддзя. Аднак – да сярэдзіны 20-х даследчыя работы рабіліся ў большасці выпадкаў гісторыкамі, якія прытрымліваліся пазіцый буржуазнай гістарыяграфіі: дзяржаўнай школы (В.І. Пічэта, В.Д. Дружчыц [Друшчыц]), нацыянальнай тэорыі "залатога века", "адзінага патока" (У. Ігнатоўскі, М.В. Доўнар-Запольскі).

Размежаванне поглядаў на БНР адбылося яшчэ ў пачатку 20-х гг. У адзін лагер уваходзілі гісторыкі, якія разглядалі БНР праз прызму бальшавіцкай ідэялогіі (А.Ф. Мяснікаў, А.Р. Чарвякоў). У іх канцэпцыі ўпершыню ўзнікае погляд на БНР як на другарадную з'яву ў параўнанні з БССР. Па-першае, гэта можна растлумачыць тым, што БНР лічылася варожым савецкай уладзе ўтварэннем. Па-другое, тэматыка БНР не ўспрыймалася савецкай навукай з павагай, таму што ідэя суверэннай буржуазна-дэмакратычнай рэспублікі не ажыццявілася; БНР – у большасці выпадкаў не была прызнана краінамі свету. Доўгі час адмоўная ацэнка спробы стварыць асобную ад РСФСР краіну ў 1918 годзе Беларускай Радай была пануючай у айчыннай гістарычнай навуцы. (1)

Тым больш цікава звярнуцца да абмеркавання ў гэтым артыкуле самай першай літаратуры аб становішчы краіны ў 1917–1920 гг.. Той, якая была вызвалена ад ідэялагічных наслаенняў наступных дзесяцігоддзяў.У другім лагеры былі прыхільнікі пабудовы суверэннай дэмакратычнай Беларусі – Доўнар-Запольскі М.І., Цвікевіч А. і інш. (2) Такое размежаванне часткова можна растлумачыць ступенню ўдзелу ў стварэнні БНР ці БССР. Да сярэдзіны 1920-х гадоў з'явіліся першыя працы, якія ствараліся сучаснікамі ці нават удзельнікамі падзей. Яны састаўлены яшчэ не прафесійнымі гісторыкамі, а ,галоўным чынам, партыйнымі і грамацкімі дзеячамі, супрацоўнікамі дзяржаўных устаноў. Адсюль апісальнасць, адсутнасць тэарэтычных абагульненняў, публіцыстычнасць. Адзначаныя творы маюць характар гістарычных дапаможнікаў (знаходзяцца на мяжы паміж гістарычнымі крыніцамі і гістарычнымі даследваннямі).

Каштоўным выданнем па праблематыцы дзяржаўнага адраджэння стала кніга беларускага гісторыка **Ф.Ф. Турука "Белорусское движение" (Москва, 1921),** паколькі у ёй гісторыя нацыянальнага і рэвалюцыйнага руху беларусаў суправаджалася прылажэннем абразцоў нелегальнай літаратуры, важных дакументаў палітычных партый і арганізацый і этнаграфічнай карты беларусаў,састаўленай акадэмікам Е.Ф. Карскім ў 1917 годзе. Вядома, што Турук у 1918 –1919 гадах працаваў у Беларускім нацыянальным камісарыяце,

Наркамаце асветы РСФСР (старшыней беларускага пададдзела), быў адным з арганізатараў БДУ (1921), дзе выкладаў на кафедры беларускай гісторыі. (Пасля 1923года да беларускай тэматыкі не звяртаўся). Таму аўтар меў доступ да матэрыялаў справаводства, законадаўчых і актавых дакументаў. Асабліва хочацца вызначыць крыніцазнаўчы матэрыял звязаны з утварэннем БНР. Нарыс быў састаўлены на аснове асабістага архіва, а таксама дакладных запісак А.Л. Бурбіса, О.Л. Дыло і самога Ф. Турука, якія былі аддадзены ў маі 1920 г. у Наркам замежных спраў РСФСР, і ахопліваe" период до вторичного занятия Красной армией городов Минска и Вильно в июле 1920 г». Згодна з публікацыей Турука на момант 1921 г. па пытанню ўтварэння дзяржавы існавалі наступныя творы: *Проф. Довнар-Запольскі "Асновы Дзяржаўнасці Беларусі", Городно,1919 г.; Воронко Яз. Белорусский вопрос к моменту версальской мирной конференции, Ковна, 1919г.; Воронка Яз. Беларускі рух ад 1917 до 1920 году, Коўна, 1920 г.; Езавитов К. Белоруссы и поляки, Ковна, 1919; Канчер Е.С. Белорусский вопрос, Спб., 1918; Лёсік Я. Аўтаномія Беларусі, Менск, 1917; Цвікевіч А. Краткий очерк возникновения Б.Н.Р., Киев, 1918 г. Беларусь, Берлин, 1919 г.* Названыя аўтары з'яўляліся непасрэднымі членамі ўрада БНР : Язэп Варонка – старшыня Народнага сакратарыята, Езавітаў К.- міністр ваенных спраў, Язэп Лёсік – старшыня Рады БНР ў чэрвені-кастрычніку 1918г., Аляксандр Цвікевіч – міністр замежных спраў. Уся літаратура па вылучанай тэматыцы звяртаецца да падзей 1917 года, у прыватнасці - правядзення І-га Усебеларускага з'езда ў снежні. І гэта гістарычна апраўдана : фактычна ўжо на гэтым сходзе вызначыліся дзве асноўныя канцэпцыі будучага лёсу беларусаў. У адносінах да снежаньскага з'езду пачынае праглядвацца падзяленне на дзве гістарыяграфічныя плыні. Дзеяч савецкай дзяржавы Ф.Ф.Турук прадстаўляе афіцыйны погляд: "І Всебелорусский съезд 15 декабря при согласии и материальной поддержке Народного Коммиссариата по делам национальностей РСФСР был открыт в Минске", а разгон з'езду быў абмеркаваны на перамовах 4 студзеня 1918 г. у Брэст-Літоўску. За мяжу, кажа Турук Ф., пераносіцца работа беларускага ўраду "па рэалізацы незалежніцкага ідэалу"(у Коўна, Берлін – "Беларуская місія", Парыж- "Вярхоўны трыбунал Міра").(3) Неабходнымі для гістарыёграфаў становяцца звесткі Турука аб выдавецкай дзейнасці. На акупаванай палякамі тэрыторыі Беларусі налічвалася да 10 перыядычных выданняў і 3-4 выдавецтва: "Мінскае Асъветнае Выдавецтва", Беларускае Выдавецкае Таварыства "Крыніца", "Веда" у Вільне" і інш. У Коўне існавала выдавецкае "Таварыства імя Ф.Скарыны", беларускі друк праявіў сябе ў Рызе, Берліне ("Абвесткі беларускага дзржаўнага прэсс-бюро"), Кіеве ("Зорка"), Маскве. (4) Праца Ф. Турука "Белорусское движение» мае апісальны, дакументальны характар. Публікацыя асноўных матэрыялаў па дзейнасці ўрада БНР стала адной з першых. Асаблівую значнасць мелі: устаноўчыя граматы І, ІІ, ІІІ-я; Пастанаўленне І-га Усебеларускага З'езду аб самаазначэнні Беларусі і аб часовай краёвай уладзе; тэлеграма старшыні Савета Камісараў Заходняй вобласці наконт роспуска яго; тэлеграма на радыё германскаму канцлеру, ІІ Польскай "Радзе Рэгінцыйнай" у Варшаве; арыгінальны тэкст тэлеграмы Вільгельму.

Статыстычны і гістарычны матэрыял па беларускіх землях знаходзіцца і ў брашуры пад назвай **"Усходняя Беларусь" (Мінск, 1918).** Рэдактарам яе быў Язэп Салавей. Выданне «Народнага Сэкрэтарства Міжнародовых Справаў" выйшла па пастанаўленню ад 22 чэрвеня 1918 г. Статыстычныя сведкі даюцца па тэрыторыі Усходняй Беларусі, каб паказаць пераважную колькасць беларускага насельніцтва тых мясцін, якія пасля Брэсцкага дагавору апынуліся на баку Расіі. Пералічэнне найбольш актыўных дзеячоў беларускага руху можна

лічыць адным з першых апісанняў. "Завяршэнне беларускай палітычнай работы становіць Усебеларускі З'езд у Мінску ад 18 да 30 снежня 1917 г. н.с." Датыроўка з'езду адрозніваецца ад афіцыйнай ( новы стыль, як прынята ў гістарычнай літаратуры, адлічваецца з 1 лютага 1918 года). Рада БНР, Народны Сакратарыят пры немцах выконвалі функцыі ў магчымых межах — займаліся справай праўна-дзяржаўнага палажэння Беларусі. "Беларусы маюць веру, што Нямеччына прызнае праклямацыю незалежнасці (24/25сакавіка) і акажа ёй помач у будаванні новага жыцця, прыбавіўшы гэтак сабе ўдзячнага саюзніка".(5) Работа "Усходняя Беларусь" у навуковым аспекце выконвае функцыю статыстычнага дакумента па гісторыі адраджэння краіны з аднаго боку, і дае яшчэ адну версію дзяржаўнага будаўніцтва БНР з другога.

Праблема дзяржаўнасці Беларусі найбольш поўна раскрыта ў працах **Антона Іванавіча Цвікевіча.** У рабоце **"Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики»** ім даецца наясненне блытаніны вакол датыроўкі з'езду. Паколькі ініцыятыва аб скліканні яго зыходзіла адначасова ад Вялікай Беларускай Рады, Усерасійскага Савета Сялянскіх дэпутатаў і пастанаўленняў II Беларускага З'езда ў Маскве, былі дадзены дзве даты адкрыцця – 5 і 15 снежня. Афіцыйна з'езд пачаў работу пасля трох дзён перамоў – 8 снежня, а 8-16 снежня ішла арганізацыйная работа. (6)

Публікацыя Цвікевіча **"Беларусь",** якая была выдана Надзвычайнай Дыпламатычнай Місіяй Беларускай Народнай Рэспублікі ў **Берліне 1919 г.** была не першым яго асэнсаваннем утварэння БНР і спробай падаць яго заходнееўрапейскім палітыкам, для якіх будучыня славянскіх нацый "облеклась в априорную формулу Федеративной России».(7) Патэнцыяльны канкурэнт, які жадаў выступіць цэнтрам аб'яднання — Польшча, заявіў аб сваёй гатоўнасці прадаставіць Літве, Беларусі, Украіне і Галіцыі самую шырокую аўтаномію. Пасля кароткага экскурса ў гісторыю Беларусі, аўтар абвяшчае выступленне на арэну самога беларускага народа. Прадстаўляючы "незалежніцкую" пазіцыю, А Цвікевіч заяўляе, што палітычнае самаўпраўленне не даецца, яго трэба браць, што і адбылося ў снежні 1917 на "Вялікім Усебеларускім Кангрэсе, ад якога вядзецца існаванне Беларускай Народнай Рэспублікі". (Заўважым гэтую акалічнасць, паколькі і дагэтуль пачатак БНР даецца ў размытых межах і сучаснай гісторыяграфіяй часцей адносіцца да выдання І, II Статутных грамат). А.Цвікевіч таксама спасылаецца на выданне М. Доўнар-Запольскага, дзе знаходзілася карта больш дакладных межаў БНР, прадстаўленая беларускай дэлегацыяй на Мірную Канферэнцыю ў Парыжы. Гэтыя межы былі вызначаны згодна з *"Картой разселенія белорусскаго племени. Изд. Российской Академии Наук. С.П.Б. 1917".* Ва ўмовах нямецкай акупацыі краю 1918 г, Цвікевіч уладу расійскую ці польскую на тэрыторыі Беларусі лічыць малаверагоднай: "Более грозна третья альтернатива: раздел Белоруссии на великорусскую и польскую сферу влияний" (атрымалася, што гэтая думка стала прадсказальнай). У цэлым выданне А.Цвікевіча "Беларусь", якое характарызуе самаацэнку дзейнасці ўрада БНР на бягучы момант, прадстаўляе спробу звярнуць увагу міжнародных арганізацый да праблемы захавання суверэнітэту БНР, можна лічыць гістарычным даследваннем.

У вывучэнні беларускага нацыянальнага руху крыніцай з'яўляецца праца **Язэпа Варонкі "Беларускі рух",** дзе аўтар дае гісторыю паступовага збліжэння Рады БНР і Літоўскай Тарыбы, апісвае дыпламатычныя зносіны, змяшчае больш падрабязны, чым у Турука, аналіз нацыянальнага друку.

Працы **Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага** ў шэрагу твораў гісторыяграфіі БНР адрозніваюцца прафесійна глыбокім падыходам гісторыка да праблем беларускай дзяржаўнасці. Свае адносіны да БНР ён выказаў у артыкуле "Лёсы зроблены" (8 красавіка 1918 г.): "Мы не спяшаліся адыйсці ад нашай усходняй сястры, але пецярбургскія правіцелі абрабавалі нашу бедную краіну, не далі ў ёй скласціся праўленню на федэратыўных або аўтаномных пачатках і кінулі нашу Радзіму на волю лёсу".(8) У канцы сакавіка 1918 г Сакратарыят БНР даручыў Доўнар-Запольскаму арганізаваць Беларускі Універсітэт у Мінску. У маі – кастрычніку ў складзе дыпламатычнай місіі БНР у Кіеве ён вёў перагаворы з прадстаўнікамі РСФСР, Украіны, Дона, Германіі, Аўстра-Венгрыі аб прызнанні Беларусі суб'ектам міжнароднага права. Па даручэнню ўрада для гэтага гісторык стварыў **"Мемуар"** ("Асновы дзяржаўнасці Беларусі") у якім абгрунтаваў неабходнасць гэтага. У нарысе **"Асновы дзяржаўнасці Беларусі"** вучоны выказвае блізкую да "незалежнікаў пазіцыю – пачатак дзяржаўнасці трэба шукаць у падзеях І Усебеларускага з'езда. (9) Тэкст гэтай брашуры, прывезены А. Цвікевічам з Кіева ў Мінск у 1919 г. надрукаваны ў Гродна і Вільні (на рускай, беларускай, польскай, нямецкай, французскай і англійскай мовах), што дало магчымасць выкарыстаць яе замежным беларусаведам. Афармленая канчаткова канцэпцыя БНР у **"Гісторыі Беларусі"** (доўгі час у выглядзе рукапісу), з 1926г. захоўвалася ў партархіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, які з 1992 г. стаў часткаю Нацыянальнага архіва РБ. Асаблівую ўвагу ў главе "Барацьба за дзяржаўнасць" Мітрафан Віктаравіч надае апісаннюУсебеларускага з'езду. "З 18 па 25 лютага Сакратарыят быў адзінай уладай на Беларусі", - адзначае аўтар (тыя некалькі дзён, з моманту, калі савецкая ўлада пакінула Мінск да афіцыйнага ўсталявання нямецкай акупацыйнай улады). Заўважым, што Народны Сакратарыят быў створаны толькі 21 лютага. Выказваецца абурэнне, якое вызвана разгонам з'езду, сімпатыя да стваральнікаў беларускага ўраду. Падрабязна апісана дыпламатычная дзейнасць урада ў Кіеве, Адэсе. Узнікненне БССР гісторыкам уключана ў адзіны працэс дзяржаўнага будаўніцтва і гэтай заключнай стадыі даецца назва "Саветызацыя Беларусі": "Так пад савецкай [эгідай] адлілася беларуская дзяржаўнасць, класавыя пошукі пераважнай масы насельніцтва атрымалі прызнанне". Такім чынам, Доўнар-Запольскі ў далейшым не вылучае паняцця БНР, акцэнтуе ўвагу на дзейнасці Рады і характэрызуе перыяд 1917-18 гг. як пераддзяржаўны. Трэба адзначыць, што такі падыход быў вядучым у савецкай гістарычнай школе. (10)

Праблематыка БНР як тэма вартая павагі і вывучэння выступае ў афіцыйнай навуцы Беларусі на першы план толькі з падзеннем савецкага рэжыму ў канцы 80-х — пач. 90-х гг. XX ст., паколькі яна прадстаўляла сабою мадэль альтэрнатыўнага развіцця дзяржаўнасці на Беларусі. Патэнцыял гэтай ідэі нацыянальнай дзяржавы часткова быў выкарыстаны падчас стварэння незалежнай Рэспублікі Беларусь. Рэпрынтныя перавыданні кніг А. Цвікевіча, А. Турука, Я. Варонкі і іншых аўтараў у 90-х гадах XX ст. далі магчымасць пазнаёміцца з поглядамі сучаснікаў існавання БНР. Вось якую ацэнку дае гэтай літаратурнай спадчыне В.Круталевіч:"Палажэнні Устаўных грамат БНР у вядомай ступені "стыкуюцца" з канцэпцыяй прававой дзяржавы. У граматах ўтрымліваліся ідэі, якія цяпер з перабудовай грамадства па заходнему ўзору прызнаюцца як дасягненне сусветнай палітычнай культуры. Гэта свабода слова, друку, сходаў, забастовак, саюзаў, свабода сумлення, недатыкальнасць асобы і жылля, васьмігадзінны рабочы дзень і раўнапраўе нацый. Нарэшце, і гэта самае галоўнае, прызнанне прыватнай уласнасці як асновы свабоды асобы. Стварэнне Устаноўчага

сейма Беларусі меркавалася на асновах усеагульнага, роўнага, прамога, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права". (11)

Абагульняючы гісторыяграфічны нарыс літаратуры 1918 –1920гг. можна сказаць, што яна значна адрозніваецца ад далейшых распрацовак праблемы БНР. Публікацыі яшчэ носяць дакументальны, апісальны характар, а таму знаходзяцца на мяжы паміж гістарычнай крыніцай і навуковым даследваннем. Погляд на дзяржаўна-палітычны этнагенез за далеччу дзесяцігоддзяў ад нашых дзён багаты на разнастайнасць датыроўкі падзей, але адпраўным пунктам дзейнасці першага ўрада на Беларусі лічыцца I Усебеларускі з'езд. Выданні ў гарадах Коўна, Берліне, Вільна сведчаць аб актыўнай знешнепалітычнай дзейнасці ўрада. Разважанні актыўных дзеячоў нацыянальнага будаўніцтва прасякнуты аптымізмам і горачу расчараванняў адначасова, тым не менш легытымнасць рэспублікі не падвяргаецца сумненню. У работах М.В. Доўнар-Запольскага больш пераканаўчым выступае палітычнае справаводства Рады БНР. Звярнуўшыся да дакументальнай дакладнасці Доўнар-Запольскага М.В., Турука Ф.Ф., адхіліўшы "нацдэмаўскія" погляды стваральнікаў БНР, гістарыяграфія краіны ў канцы 20-х - 30-я гг. пачне новы віток.

Літаратура.


1. Чарвякоў А. За Савецкую Беларусь. Мн., 1927; Парэчын Г. Ідэя беларускай дзяржаўнасці перад утварэннем Савецкай Беларусі // Запіскі аддзела гуманітарных навук БАН. Мн., 1929. Працы кафедры сучаснага права, т. 1; Зюзькоў А. Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі. Мн., 1931 і інш.
2. Варонко Я. Беларуская справа, міравой нарады ў Версалі: Гіст.-паліт. нарыс. Коўна, 1919; Яго ж. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: Кароткі агляд. -. Коўна, 1920 (Друк. А. Бака і Х.Манкес).-29 с.; Езовитов К. Белорусы и поляки: Документы и факты из истории оккупации Белорусии поляками в 1918 и 1919 гг.: Пер. с бел. Ковна, 1919; Яго ж. Освобождение Минска//. Варта. 1918. №1; Крэчэўскі П. Матэрыялы і дакументы // Замежная Беларусь. Прага. 1926. Кн. 1;Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў ( 1903 – 1928 ). –Вільня: Беларус. выд. т-ва, 1928.
3. Турук Ф.Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов. - [Воспр. изд. 1921] – Мн., 1994, -144 с.- с. 52.
4. Там жа – с. 67.
5. Усходняя Беларусь: статыстычныя і гістарычныя матэрыялы.- Рэпрынт выд. Менск: друкарня Я.А. . Грынблята, 1918 г.- Мн.: Бел каап. выд. "Адраджэнне", 1993 – 13 с.
6. Цвикевич А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики.- Киев : Тип. И.И. Чоколова, 1918.-16 с.
7. Цвикевич А. Беларусь: Полит. очерк : Пер. с белорус.-Берлин: Изд. Чрезв. дипломат. миссии Белорус. нар. Республики, 1919.-29 с.- С.-3.
8. Довнар-Запольский М.В. Жребий брошен! // Цвикевич А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики.-Киев,1918.-С. 2.
9. Доўнар-Запольскі. Асновы Дзержаўнасці Беларусі.Нарыс.-Городно, 1919.
10. Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя беларусі / Беларус. Энцыкл., Нац. арх. Рэсп. Беларусь; Пер. з рус. Т.М. Бутэвіч, Т.М.Кароткая, Е.П.Фешчанка.- Мн.: БелЭн, 1994.-с. 496.
11. Літвіновіч Я. Шлях да дзяржаўнасц // ЛіМ. – 1999.-23 крас.-С.-3.